Funded by the European Union
BELARUS BEEHIVE



# Фандрайзінг для грамадска-культурніцкіх праектаў | Модуль 1. Грантавы фандрайзінг

## Дадатковы матэрыял да лекцыі 1.2

## Табліца-дапаможнік | Тры ўзроўні нематэрыяльнага выніку

| УЗРОВЕНЬ | ШТО АЗНАЧАЕ | ІНСТРУМЕНТЫ ВЫМЯРЭННЯ | ПРЫКЛАДЫ ІНДЫКАТАРАЎ |
|---|---|---|---|
| **ВЕДЫ І ІНФАРМАВАНАСЦЬ** | Чалавек даведаўся нешта новае пра тэму праекта. | ✓ апытанні да/пасля;<br>✓ тэсты на веды;<br>✓ аналіз паводзінаў аўдыторыі пасля кантакту з праектам;<br>✓ колькасць новых падпісчыкаў (на працягу тыдня пасля праекта);<br>✓ арганічны пошук (па звязаных тэмах);<br>✓ колькасць рэпостаў з уласным каментаром. | · 73% удзельнікаў адзначылі павышэнне ўзроўню ведаў.<br>· За тыдзень пасля мерапрыемства колькасць новых падпісчыкаў павялічылася на 500 чалавек.<br>· Сярэдні час знаходжання на сайце павялічыўся на 2 хвіліны. |
| **АДНОСІНЫ І ІДЭНТЫЧНАСЦЬ** | Чалавек пачаў па-іншаму ўспрымаць:<br>· сябе,<br>· сваю культуру,<br>· сваю ідэнтычнасць. | ✓ інтэрв'ю (праз 6 месяцаў);<br>✓ most significant change (адно пытанне «што самае значнае змянілася для вас у выніку ўдзелу ў гэтым праекце?»);<br>✓ наратыўны аналіз (як людзі распавядаюць гісторыі);<br>✓ шкалы 1-5 (адчуванне прыналежнасці, сувязі). | · 68% удзельнікаў адзначылі сувязь з беларускай культурай.<br>· 5 інтэрв'ю з удзельнікамі — усе апісалі змены ва ўспрыманні сябе як беларуса.<br>· Ацэнка прыналежнасці вырасла з сярэдняга 2,5 да 4,1 (па шкале ад 1 да 5). |
| **ПАВОДЗІНЫ І ДЗЕЯННІ** | Чалавек пачаў па-іншаму дзейнічаць:<br>· часцей выкарыстоўвае мову,<br>· запускае ўласныя праекты,<br>· стаў актыўнай часткай супольнасці. | ✓ адсочванне дзеянняў;<br>✓ follow-up апытанні (праз 6-12 месяцаў);<br>✓ партнёрскія даныя (хто стаў новым удзельнікам пасля нашага праекта);<br>✓ дакументаваныя гісторыі. | · 40 чалавек запусцілі ўласныя ініцыятывы.<br>· 10 удзельнікаў выкарыстоўваюць мову ў паўсядзённым жыцці.<br>· Да 6 арганізацый далучыліся новыя ўдзельнікі. |